Правительство Южной Кореи планирует отправить в Ирак до 3000 своих военных, которые должны выполнять миротворческие задачи на севере страны. В настоящее время в Ираке работает примерно 600 корейских военных медиков и инженеров.

Пентагон получит 25 миллиардов долларов на войну



Палата представителей Конгресса США приняла бюджет Министерства обороны страны. Пентагону решено выделить 417 миллиардов долларов, 25 из которых — выделены дополнительно, специально на военные операции в Афганистане и Ираке. Согласно законопроекту, 9,7 миллиарда должны быть потрачены на ПРО, 1,7 — на создание и разработку защиты от химического и биологического орудия, 4,4 миллиарда — на программу Joint Strike Fighter и 710 миллионов — на беспилотные воздушные боевые системы. Некоторые конгрессмены остались недовольны тем, что Пентагон не обнародовал свои долгосрочные прогнозы стоимости войны с терроризмом. "Если бы в этом законопроекте учитывалась полная стоимость ведения военных действий на весь год, — заявил республиканец Дэвид Оби, — мы бы выделили на 50 миллиардов больше, чем сегодня. После выборов общественности наверняка сообщат об очередном взносе".

Между тем бюджет Пентагона был принят подавляющим большинством голосов. За него проголосовали 403 законодателя, против — лишь 17.

Шарон просит Египет не лезть в процесс отделения от палестинцев



Премьер-министр Израиля Ариэль Шарон заявил, что хотя он и придает большое значение переговорам с Египтом по поводу его роли в секторе Газа, он не намерен позволять ему стать посредником между израильтянами и палестинцами. Шарон сделал это заявление на встрече с министром обороны Израиля Шаулем Мофазом, министром иностранных дел Сильваном Шаломом и военным руководством перед встречей с главой разведывательных служб Египта Омаром Сулейманом, который в среду прибыл в Иерусалим. Шарон заявил, что план отделения Израиля остается односторонним и указал, что возобновление переговоров с ПА при посредничестве Египта сорвало бы отделение Израиля и поставило под угрозу получивший международную поддержку план мирного урегулирования.

Кроме того, Шарон заявил, что израильским официальным лицам пора прекратить публично высказывать свои взгляды о переговорах Израиля с Египтом относительно отделения. "Период, когда все расхваливают свои идеи перед египтянами и перед европейцами закончен, — сказал Шарон. — С этого момента все взгляды будут определяться форумом, который мы создали для обсуждения этого вопроса".

Несмотря на реакцию Шарона, Сулейман подчеркнул, что Египет намерен продолжать продвигать план разделения Израиля и Палестинской автономии в сотрудничестве с обеими сторонами.

Кремль создает собственный «знак качества»

С 2005 года Управление делами президента России введет специальный знак качества для производителей — "Кремлевский стандарт", а также почетный титул "поставщик Кремля". О том, станет ли автоматически обладатель этого звания реальным поставщиком Кремля, не сообщается. Дизайн значка пока не утвержден, но, как стало известно газете, скорее всего в его основе будет использовано изображение двуглавого орла. Авторы идеи из ФГУП "Кремлевский" при Управлении делами президента считают, что это звание станет преемником торговой марки "Поставщик двора Его Императорского Величества".

Звание будет присваиваться на конкурсной основе. По результатам конкурса жюри, в состав которого войдут ученые Российской академии наук, выдаст предприятиям, показавшим хорошие результаты, сертификаты "рекомендовано к использованию в Кремле", а победителям — "принято к использованию в резиденции Президента РФ".

Во время конкурса будет учитываться не только качество товаров, но также и репутация фирмы, как она платит налоги, ее финансовая "прозрачность".



Иран передумал освобождать британских моряков

Иран отложил освобождение восьми британских моряков, захваченных ранее. Ранее появилась информация, что моряков уже освободили, однако после этого иранский спутниковый телеканал "Аль-Алам" сообщил, что их освобождение, по всей вероятности, откладывается "из-за нехватки времени, так как делегация прибудет в нужное место лишь поздно вечером". О какой именно делегации идет речь не совсем ясно, но журналисты Рейтер отмечают, что делегация британских дипломатов уже прибыла в провинцию Хузестан, на юго-западе Ирана.

Напомним, что британские военные моряки были задержаны в понедельник, когда они на трех катерах двигались по каналу Шатт аль-Араб, в районе которого проходит граница между Ираном и Ираком. На катерах были обнаружены оружие и карты. Сами моряки заявили, что попали в территориальные воды Ирана по ошибке.

Для продления визы в США иностранцам придется вернуться домой

Госдепартамент США объявил о прекращении практики продления виз с 16 июля 2004 года. Это постановление не распространяется на визы категории A и G для дипломатов и официальных лиц и сотрудников NATO. "Госдепартамент с 16 июля прекращает рассмотрение заявок на продление виз категории E, H, I, L, O, P", — говорится в заявлении этого ведомства. Лица, въехавшие на территорию США по визе одной из этих категорий, могут пребывать в стране до истечения срока действия визы. Если же они покинут пределы Соединенных Штатов, а затем захотят вернуться туда, им придется обратиться за новой визой в посольство или консульство США в своей стране и пройти собеседование по новым правилам, включая и снятие отпечатков пальцев. Ранее документы на продление визы можно было отослать по почте.

Эта мера позволит американским властям к 26 октября обеспечить выдачу виз, включающих биометрические данные прибывающих в страну людей, как этого требует законодательный акт "Об усилении безопасности на границе и реформе визового въезда", принятый в 2001 году.

ЕВРО-2004: ЗАКУЛИСЬЕ

Четвертьфиналы: торг здесь неуместен!

Всё! С «групповухой» на чемпионате Европы покончено. Позавчера поздно вечером определился последний четвертьфиналист Евро-2004, команды разбились на пары.

Многие уже начинают охать да ахать: *"Как же это дальше без Испании?.. Как же без Италии?.."* Теперь к этой обойме воздыхатели причислили еще и "немецкую машину", которая на этом первенстве давала такие пробуксовки, что ахать приходилось уже по другому поводу.

Чтобы попасть в 1/4 финала, немцам достаточно было выиграть у чехов с любым счетом, и, учитывая, что на ничего не решающий для команды матч чешский наставник Карел Брюкнер выпустил на поле лишь несколько футболистов, претендующих на статус "основных", это было вполне реально. Но чехи сыграли красиво и, главное, честно. 2:1 — и немцы "на лопатках".

Их одногруппникам — голландцам — оставалось только победить уже изрядно измотанную, но гордую сборную Латвии, что они, собственно говоря, и сделали не без помощи судьи — 3:0. А перед латышами можно только снять шляпу. Вот пример того, чего может достичь команда при правильном подходе в стране к футболу!

Теперь же начинаются четвертьфиналы и, кроме всего прочего, вовсю пошла "охота" за футболистами. Чемпионат Европы — это не только футбол, но и огромный рынок. За юное английское дарование Руни клубы уже торгуются, за шведа Ибрагимовича сражаются итальянцы, болгарин Бербатов прямым ходом отправляется из Германии в Милан, грек Сейтаридис переходит в лучший клуб Европы — "Порту". Одни россияне невостребованные.

А вот тренерам половины команд после 4 июля скорее всего придется расстаться со своими сборными. Окончательное решение о своем уходе приняли француз Сантини, который будет тренировать английский "Тотенхэм", и хорватский наставник Отто Барик, "навостривший лыжи" на Австрию. Говорят, что "сочтены дни" голландского тренера Дика Адокаата (посмотрим, как голландцы будут дальше играть) и его итальянского коллеги Джованни Траппатони, собираются поменять главных испанцы и болгары.

А на чемпионате начинается самое интересное. И здесь, как восклицал Киса Воробьянинов, торг неуместен.

Алесь СИВЫЙ.



На фото: *Руд ван Нистелроэй может быть доволен своей игрой.*

ЭКСКЛЮЗІЎ

Пакуль круціцца кола...

"КОЛА" — так называецца апошні фільм маладога, але ўжо сусветна вядомага беларускага кінадакументаліста Віктара АСЛЮКА, які атрымаў за кінастужку шэраг узнагарод на міжнародных кінафестывалях. Самай значнай рэжысёр лічыць прыз за лепшы кароткаметражны фільм, нядаўна прысуджаны карціне на адным з самых прэстыжных у свеце фестываляў дакументальных фільмаў "РЭАЛЬНАЕ КІНО", які праходзіў у Парыжы.

А перад гэтым вялікі поспех напаткаў яго кінакарціну "Мы жывем на краі": Сярэбраны кентаўр за лепшы дакументальны фільм на фестывалі ў Санкт-Пецярбургу, Гран-пры на фестывалях у Партугаліі і Грэцыі, прыз Еўропы за лепшы неігравы тэлевізійны фільм на фестывалі ў Берліне... Кінастужка атрымала таксама Ганаровы прыз Міжнароднай арганізацыі кінакрытыкаў і была намініравана на прыз Еўрапейскай кінаакадэміі.

Цікава, што абодва фільмы, што выклікалі такое захапленне ў Еўропе, аб'ядноўвае агульная тэма — беларуская вёска.

Бабулькі, цікавыя ўсяму свету

— Чаму вашы апошнія фільмы менавіта пра вёску? — пацікавілася я ў Віктара.

— Я лічу, што наша вёска — самая ўдзячная тэма для дакументальнага кіно, — сказаў Аслюк. — Там жыццё цячэ сярод прыроды і таму больш натуральнае, у вяскоўцаў вельмі выразныя твары і распісаныя жыццём рукі... Усё гэта ёсць і ў горадзе, але хаваецца за фасадамі дамоў і ў натоўпе. У горадзе з цягам часу збіраецца шмат наноснага і амаль маргінальнага, а маргінальнасць для дакументаліста — страшная рэч, бо яна робіць чалавека невыразным. Яшчэ адна прычына ў тым, што я сам нарадзіўся ў вёсцы, дзе амаль нічога не засталося ад таго, што было гадоў трыццаць назад.

— Чым зацікавіла вас Дубна, дзе вы здымалі карціну?

— Я прачытаў у газеце, што гэта вёска на Гродзеншчыне падмываецца Нёманам, вырашыў з'ездзіць і паглядзець. Я ніколі не прыдумваю сюжэтаў, а здымаю тое, што бачу. Дубна сапраўды мяне зацікавіла: у яе жыхароў на працягу двухсот гадоў была традыцыя ранняй вясной пераганяць кароў на другі бераг Нёмана, дзе яны пасвіліся і начавалі. А жанчыны кожны вечар ездзілі на чоўнах даіць іх. Восенню кароў зноў заганялі ў хлеў. Вось і ўсё. Калісьці ў людзей было дзвесце кароў, а калі мы прыехалі, засталося ўсяго дванаццаць. Праз год я зноў пабываў у Дубне, кароў там ужо не было: хтосьці здаў сваю на мяса, хтосьці пусціў у саўгас.

— І што вы ўбачылі за гэтым, даволі банальным для Беларусі сюжэтам?

— Мне здавалася, што лёс Дубны — гэта вобраз сыходзячай традыцыйнай вясковай цывілізацыі, на якой грунтуецца ўся беларуская культура. І мне вельмі шкада гэтай адыходзячай вёскі, якая мела мноства мінусаў, але і шмат арыгінальнага, аб чым мы шкадуем і па чым плачам.

— Вы спецыяльна далі фільму двухсэнсоўную назву?

— Назву многія ўспрымаюць як сацыяльную, на самай жа справе жанчына, якую я здымаў, сказала: "Мы жывем на краі". Яна мела на ўвазе: на краі вёскі, дзе нават вуліца з хатамі абвалілася ў Нёман. Але ў цэнтры — выдатныя цагляныя дамы, дзе жывуць добрыя гаспадары, на вуліцах няма запусцення. Адна дэталь: як казалі мне старыя, гэта — не іх дзеці, а прыезджыя. Там пабудаваны нейкі комплекс, і адусюль прыехаў народ. Мы, напрыклад, сустрэлі ўкраінцаў, якія гаварылі на нейкай дзіўнай рускай мове. Старыя прасілі, каб у вёсцы пакінулі іх дзяцей, але кіраўніцтву па нейкай прычыне лепш было ўзяць людзей з боку. Таму жывуць там цяпер чужыя, а мясцовыя з'ехалі ў Масты і Гродна. Але дасканальна я сітуацыяй не валодаю, усё гэта мне расказалі старыя.

— Што ці хто больш за ўсё ўразіў вас на здымках?

— Бабулькі. Успамінаючы твары вясковых жанчын, іх размовы, заўсёды становіцца неяк спакайней на душы. Іх мудрасць ідзе не столькі ад адукаванасці, колькі ад пражытага жыцця.


— Ваш апошні фільм "Кола" таксама пра вёску. Ці доўга вы будзеце працягваць гэтую тэму?

— У "Коле" я старых не здымаў, у цэнтры стужкі — адзіная на ўсю вёску маладая сям'я: муж, жонка, дзіця. Бацькі будуюць дом у спадзяванні, што ў ім будуць жыць іх дзеці, і ўсё гэта не адыдзе, пакуль круціцца кола жыцця. Адзін чалавек, убачыўшы "Кола", сказаў, што гэта фільм пра ўсю нашу цывілізацыю. Увогуле я хачу зрабіць тры фільмы пра вёску, але пра што будзе трэці, пакуль не ведаю.

Цэнтр зямлі там, дзе твой дом

— Як вы лічыце, у Беларусі тэм для дакументалістаў многа?

— Для нас саміх — многа, бо жыццё вакол вельмі складанае і цяжкае, і прымітыўных сюжэтаў амаль няма, — сказаў рэжысёр. — Але для Захада, па словах замежных прадзюсераў, — мала. Адзін з іх сказаў мне: "У вас усяго пару тэм можна знайсці, якія цікавяць свет, — Шагала ды яшчэ што-небудзь...".



Віктар Аслюк з сынамі.

— Але ж вашы бабулькі зацікавілі Еўропу?

— Правільна. І таму, на маю думку, асноўная памылка маладых рэжысёраў у тым, што яны бяруць заходні матэрыял і спрабуюць вырашыць яго па-заходняму. А трэба зразумець, што цэнтр зямлі і ўсяго Сусвету — там, дзе твой дом. І здымаць тое, што цікава табе, так, як адчуваеш ты, і заставацца пры гэтым максімальна шчырым.

— Вы лічыце, што перш за ўсё трэба жыць сваім жыццём?

— Зараз многія плачуць: Шырак, маўляў, сказаў, што праз сто гадоў Еўропа вымрэ, калі будзе нараджацца столькі дзяцей! Што ж, можна жыць і ў такім кантэксце. Можна жыць тэлевізійным жыццём, перажываць за тое, што робіцца ў Гандурасе, і не думаць пра тое, што адбываецца побач, і не ведаць пра тое, што страчваецца дома. А я лічу, што на ўсе падзеі свету мы павінны глядзець са свайго кутка, з інтарэсаў сваёй зямлі. Самае лепшае, што ў нас ёсць, — гэта наша гісторыя. І нацыя наша складаецца не толькі з тых людзей, што жывуць побач, але і з тых, што былі да нас, — у нас усё на іх могілках пабудавана і мы па іх праху ходзім.

— Гістарычную памяць падтрымліваюць нейкія матэрыяльныя помнікі, а ў нас іх застаецца ўсё менш...

— Правільна, у Італіі, скажам, каменны домік як стаяў у сярэднявечча, так і зараз стаіць, а ў нас усё ў асноўным з дрэва: хата знікае, і можна месца, дзе яна стаяла, не знайсці. Таму трэба нам прыводзіць у парадак сваю зямлю, адбудоўваць свае цэрквы, касцёлы і гарады. Менавіта ў гэтым павінна быць наша нацыянальная ідэя, якую мы ніяк не можам вызначыць.

Успомніце, як адбудоўвалася Варшава: няхай не з тых самых каменняў, але хто ўспомніць пра гэта праз трыста гадоў? Калі людзі нешта адбудоўваюць, яны здзяйсняюць духоўны акт, і ўсё адбудаванне напаўняецца іх духам. І гэта захоўвае народ, не дае яму прапасці і размыцца. А зараз наступаюць часы, калі ўсё становіцца размытым: мараль, межы дазволенага і недазволенага, граніцы. І трэба процістаяць гэтаму. Невыпадкова Еўропа з аднаго боку — аб'ядноўваецца, а з другога — там узнікае яшчэ большая цікавасць да свайго і яшчэ большае жаданне захаваць свае камяні, свае музеі, сваю гісторыю, сваю мову... У Францыі, напрыклад, вас не вельмі выручыць інтэрнацыянальная англійская мова, там трэба ведаць французскую!

— Як можам мы параўноўваць сябе з еўрапейцамі, калі не толькі не валодаем роднай мовай, але нават саромеемся яе! Патрэбны час, каб свядомасць у людзей памянялася.

— А ў нас ужо ёсць новыя людзі, якія адчуваюць усё зусім па-іншаму. Гэта абсалютна новае пакаленне, якога не было яшчэ гадоў дваццаць таму. Яно цікавіцца сваёй гісторыяй, зусім па-іншаму думае і ўспрымае свет.

Аднойчы я ехаў у Вену. У цягніку малады хлопец гаварыў з палякамі па-беларуску. Палякі яго разумелі, хаця старая пані пацікавілася: "Што гэта за мова такая? Я ўсё слухаю, слухаю, але ніяк не зразумею, — гэта ж, здаецца, не расійская?" Спачатку я толькі назіраў, потым мы пазнаёміліся. Аказалася, што Максім, так называлі хлопца, ужо сем гадоў жыве ў Вене, вельмі хацеў бы вярнуцца ў Беларусь, але тут няма для яго такой работы, як у Аўстрыі, і няма куды прыкласці свае сілы. Але мяне ўразіла тое, што ён нават за мяжой гаварыў па-беларуску... Так што зараз у нас складаецца новая, зусім не безнадзейная сітуацыя, бо такіх новых людзей — мноства!

Вяртанне да вытокаў

— Які фільм вы здымаеце зараз? — запыталася я ў Віктара.

— Я згадзіўся зрабіць фільм пра кінарэжысёра Міхаіла Пташука, — адказаў ён. — Пташук мне вельмі цікавы як асоба, бо і лёс яго, і праблемы, і тэмы цесна звязаны з часам, у якім ён жыў, і характэрны менавіта для беларускага рэжысёра.

— А вы не збіраецеся рабіць мастацкае кіно?

— Хацеў бы... Я дастаткова доўга працую ў кіно і пачаў разумець каштоўнасць 35-міліметровай стужкі: гэта зусім іншая філасофія і адлюстраванне на цэлулоідзе — не такое, як электроннае. Пачаў разумець я і некаторыя абмежаванасці дакументальнага кіно: па-першае, я не магу ў ім расказаць з той адкрытасцю, з якой хацелася б, пра некаторыя інтымныя рэчы, напрыклад, пра каханне. Калі людзі нешта такое робяць у дакументальным кіно, гэта заўсёды сорамна.

— Вы хацелі б праз герояў выразіць нешта сваё?

— Так, і я падаў на студыю сцэнарый па творах Васіля Быкава. Што з гэтага выйдзе, не ведаю, я чалавек асцярожны і хацеў бы зрабіць спачатку кароткаметражны фільм. Менавіта кароткаметражнае кіно нараджае рэжысёра, і адна з праблем некаторых маіх калег у тым, што яны недастаткова знялі кароткаметражных карцін.

— Чаму вы выбралі творы Быкава, многія ж з іх ужо былі экранізаваны?

— А хто экранізаваў "Мёртвым не баліць" альбо апошнія апавяданні Быкава? Ніхто! Я лічу, што трэба вяртацца да сапраўднага Быкава.

Ганна АРЦЮШКЕВІЧ.

дактрына

задачы)

Карыстаючыся настальгіяй расійскага грамадства па былой велічы і гуляючы ролю надзейнага бастыёна Расіі на Захадзе, сённяшняму кіраўніцтву Беларусі ўдалося часткова аднавіць экспарт танных энергарэсурсаў з Расіі і захаваць за беларускімі прадпрыемствамі расійскія рынкі. У кароткатэрміновай перспектыве гэтая стратэгія аказалася ўдалай, бо яна здолела захаваць беларускую прамысловасць. Платай за гэта былі не толькі заявы аб маючым адбыцца яднанні, але і блакаванне нацыянальна-культурнага развіцця, згортванне дэмакратыі, а таксама роля на замежнай арэне "сабакі, які брэша замест гаспадара". У больш працяглай гістарычнай перспектыве гэтая стратэгія ўступала ў супярэчнасць з логікай нацыянальнага самазахавання. Дапушчальная для беларусаў мяжа аб'яднання была дасягнута дастаткова хутка. Расія арыентуецца на Захад. Яна не мае ні сіл, ні жадання змагацца з ім і не хоча болей плаціць за братэрскія пацалункі танным газам.

Кепскі імідж Беларусі прывёў да адсутнасці інвестыцый з Захаду. Адсутнасць эканамічных рэформаў і значных інвестыцый у прамысловасць вядзе да страты беларускай прамысловасцю канкурэнтаздольнасці на знешніх і беларускім рынках. Стратэгія сённяшняга рэжыму, адыграўшы сваю захавальную ролю, можа выклікаць дэіндустрыялізацыю Беларусі ў доўгатэрміновай перспектыве.

Адсутнасць дэмакратыі перашкаджае пошуку і рэалізацыі новых, больш эфектыўных стратэгій нацыянальнага развіцця, і ў гэтай сувязі пачынае негатыўна ўспрымацца большасцю насельніцтва. Перад Беларуссю паўстае задача змены адпрацаваўшай нацыянальнай стратэгіі і распрацоўкі нацыянальнай дактрыны як сістэмы звязаных эфектыўных нацыянальных стратэгій, паслядоўна рэалізуемых у доўгатэрміновай перспектыве.

Альтэрнатыўны варыянт нацыянальнай дактрыны

Пры спробе доўгатэрміновага прагнозу відавочнымі з'яўляюцца наступныя рэчы:

1. Кошт сыравіны і энергарэсурсаў з цягам часу будзе павялічвацца — рэсурсы планеты не бясконцыя. Ужо гэтае стагоддзе стане стагоддзем барацьбы за доступ да энергарэсурсаў і сыравіны.

2. Найбольш кароткія шляхі абмену сыравіны і рэсурсаў з Расіі і высокатэхналагічных тавараў з захаду Еўропы пралягаюць праз Беларусь.

3. Сабекошт тавараў для нашага рэгіёну свету аб'ектыўна ўзрастае пры перасоўванні месц вытворчасці з Захаду на Усход. Працягласць і сярэдняя тэмпература зімовага перыяду на адной шыраце істотна адрозніваецца ў Расіі і Германіі, і гэта патрабуе рознай колькасці энергіі для вытворчасці адзінкі прадукцыі.

З гэтага вынікае наша месца ў гэтым узаемадзеянні — забеспячэнне транзіту сыравіны і тавараў, а таксама экспарт высокатэхналагічных тавараў у Расію і іншыя рэгіёны свету. Беларусь павінна замкнуць на сябе частку гэтага абмену. Тавары, выраблены ў Беларусі, патрабуюць менш энергіі, чым у Расіі, і знаходзяцца да расійскіх рынкаў бліжэй, чым заходнееўрапейскія. Мы бліжэй да крыніц рэсурсаў і сыравіны, і яны абходзяцца для нас танней, чым для Захада. Нам трэба захаваць і пашырыць свой уплыў на рынках Расіі, пашырыць свой уплыў на іншых рынках. Гэта немагчыма зрабіць без імпарту тэхналогій і інвестыцый з Захаду.

Такім чынам, **на бліжэйшы перыяд** найлепшай нацыянальнай стратэгіяй для Беларусі з'яўляецца стратэгія роўнай адкрытасці ў два бакі. Нам патрэбен **неканфліктны баланс** паміж Расіяй і Захадам. Мы павінны падтрымліваць сяброўскія адносіны як з Захадам, так і з Усходам. Першае, што трэба зрабіць у гэтым накірунку, — перайсці ўнутры краіны да еўрапейскай мадэлі пабудовы эканомікі і дзяржавы. Гаворка ідзе пра эканамічную і палітычную дэмакратыю. Каб павысіць сваю канкурэнтаздольнасць на рынку інвестыцый ЕС, які забяспечвае палову ўсіх сусветных інвестыцый, нам трэба тэрмінова заявіць аб сваім намеры інтэгравацца ў Еўрапейскі Саюз.

У **сярэднетэрміновай перспектыве** гэтая стратэгія можа не спрацаваць, таму што Беларусь апынулася паміж двума вельмі моцнымі цэнтрамі прыцягнення — Расіяй і Еўрапейскім Саюзам. Мы не зможам балансаваць бясконца, нам прыйдзецца выбіраць. Членства ў ЕС дасць нам неабмежаваны доступ да інвестыцый, навейшых тэхналогій, рынку ёмістасцю ў паўмільярда самых багатых у свеце спажыўцоў. У ЕС няма дамінавання адной краіны. Значна меншыя за беларусаў народы застаюцца там гаспадарамі свайго лёсу і захоўваюць сваю культуру. Таму аптымальная стратэгія ў сярэднетэрміновай перспектыве (да 10 год) — далучэнне да Еўрапейскага Саюза з захаваннем стратэгічнага партнёрства і эканамічнага саюза з Расіяй. На фоне эканамічнага і палітычнага збліжэння Расіі і ЕС — гэта вырашальная задача. У гэты ж перыяд Расія, апынуўшыся пад пагрозай сваёй бяспецы з боку ісламскіх радыкальных сіл на поўдні, будзе шукаць членства ў НАТО. Мы павінны стаць для Расіі ў гэты перыяд "нашими людьми в Европе", а для ЕС — эканамічным плацдармам для прасоўвання тавараў і тэхналогій на Усход.

У **доўгатэрміновай перспектыве** (менш як 30 год) уплыў ЕС будзе расці. Будзе расці значнасць расійскіх рэсурсаў Сібіры і Далёкага Усходу, кантроль над якімі для Расіі можа аказацца пад пагрозай з-за росту дэмаграфічнай прысутнасці Кітая ў гэтых рэгіёнах. Вельмі верагодна, што ў сітуацыі сусветнай канкурэнцыі з Кітаем ЕС будзе гатовы да прыёму ў свой склад і Расійскай Федэрацыі. Беларускія кампаніі павінны быць падрыхтаваны да гэтага, каб прапанаваць адзінай Еўропе сваіх мэнэджэраў, напрацаваныя сувязі, веданне рэгіёнаў, каб выступіць у якасці адных з істотных распрацоўшчыкаў рэсурсаў Сібіры і Далёкага Усходу.

***

Тэмпы развіцця чалавечага грамадства растуць з кожным дзесяцігоддзем. Час робіцца ўсё больш спрэсаваным, і яго нестае на паступовую адаптацыю да новых рэалій. Мы — невялікая нацыя, і за памылкі мы плацім большую цану, чым тыя народы, што вырашаюць лёс нашай планеты. Таму мы павінны дзейнічаць свядома і спланавана, прымаючы сённяшнюю стратэгію развіцця краіны з улікам змены абставін у будучым. Каб выжыць і развівацца, мы павінны праяўляць дальнабачнасць, ініцыятыву і дзейнічаць наступальна, нават агрэсіўна. Акрамя таго, у краіне павінна пастаянна весціся дыскусія аб правільнасці яе нацыянальнай дактрыны і неабходнасці яе карэкцыі. Мэта дадзенага матэрыяла — пачаць гэтую дыскусію.

УВАГА: КОНКУРС!

Вандруем разам!

Рэдакцыя газеты «Народная воля» сумесна з турыстычным агенцтвам «Альтус-плюс» і маладзёжным грамадскім аб'яднаннем «Гісторыка» аб'яўляюць конкурс «Вандруем разам!»

Конкурс будзе праходзіць у два этапы. **НА ПЕРШАЙ СТАДЫІ** ад Вас, паважаныя чытачы, патрабуецца даслаць на адрас рэдакцыі **ЦІКАВАЕ** (натуральна, не самае простае) **ПЫТАННЕ ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ, АЛЬБО ПА АГУЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ.**

ДРУГІ ЭТАП — ВІКТАРЫНА. У яе будуць уключаны лепшыя пытанні, якія паступяць у рэдакцыю, а таксама тыя, што будуць падрыхтаваны арганізатарамі конкурса.

Зразумела, што пераможцаў будзе двое: у конкурсе пытанняў і ў віктарыне.

УЗНАГАРОДАЙ за перамогу на кожным з этапаў конкурсу будзе **БЯСПЛАТНАЯ ВАНДРОЎКА** па адным з маршрутаў, якія прапануюцца турагенцтвам "Альтус-плюс" і маладзёжным грамадскім аб'яднаннем "Гісторыка".

Умовы віктарыны з'явяцца на старонках нашай газеты пазней, а калі Вы вырашылі прыняць удзел у конкурсе пытанняў, то дасылайце свае лісты на адрас: **220030, г. Мінск, вуліца Энгельса, 34-А, рэдакцыя газеты "Народная воля".** Лісты, звязаныя з конкурсам пытанняў, чакаем да 5 ліпеня.

УВАГА! Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца толькі чытачы «Народнай волі», якія афармілі падпіску не менш чым на тры бліжэйшыя месяцы.

Акрамя пытання ў лісце **неабходна** ўказаць крыніцу, дзе змешчаны адказ на Вашае пытанне, і кантактны нумар тэлефона. Апрача гэтага ў канверт **абавязкова трэба ўкласці ксеракопію падпіснай квітанцыі на "Народную волю"**, а на канверце пазначыць: **"Вандруем разам!"**. Удзельнічайце і вандруйце разам з намі.

Вядучы конкурсу Віталь ГАРБУЗАЎ.

НОВЫЕ ТЕХНОЛОГИИ

ВИДЕОстоматология

В середине мая в рубрике "Любопытно" "Народная воля" опубликовала информацию о том, что некий лондонский стоматолог предлагает своим пациентам во время лечения надеть видеоочки, подключенные к DVD-плейеру, что позволяет больным расслабиться, отвлечься от процедуры, которая привычно считается неприятной. Автор заметки явно хотел впечатлить читателей заморской диковинкой.

Через некоторое время в редакцию позвонили из медицинского центра "Экомедсервис": "Разве это новость? Мы тоже не лаптем щи хлебаем. Давно уже используем эту аппаратуру. Результатами довольны и врачи, и пациенты. Приходите, посмотрите..."

На первый взгляд вроде обычный стоматологический кабинет, и все же глаз отмечает современный дизайн стоматологической установки и кресла, лишенного даже намека на "кушеточность", непонятные приспособления и детали. На отдельном столике стоят компьютер, DVD-плейер.

— Этот компьютер подключен к радиовидеографу, — заметив мою заинтересованность, спешит объяснить заведующая стоматологическим отделением медицинского центра "Экомедсервис" **Елена Константиновна ТРОФИМОВА**. — Снимок зуба передается в компьютер, и врач может детально рассмотреть его на мониторе. При помощи более чем 10 аналитических программ можно измерить плотность костной ткани, определить размеры костного дефекта, рабочую длину корневого канала зуба, выделить для анализа и увеличить какую-то зону, увидеть псевдообъемное изображение и оценить его в цвете. Такое количество вариантов диагностики повышает качество лечения.

Видно, что заведующая гордится имеющимися у врачей возможностями и о работе может говорить бесконечно.

— А вот и наши видеоочки, — Елена Константиновна просит врача кабинета надеть их и сесть в кресло. Спинка кресла опускается, человек практически лежит и можно начинать лечение. Очки регулируются по размеру головы, в них вмонтированы наушники. Пациент скорее похож на пилота космического корабля из фантастического фильма, чем на представителя самой мирной профессии.

— Спросите: зачем стоматологи приобретают такую дорогую игрушку? — рассуждает Елена Константиновна. — Существует извечная проблема страха перед болью. Вызванные им напряжение, ощущение тревоги заставляют человека откладывать визит к стоматологу. Все это ведет к нарастанию проблем во рту: неэстетичный внешний вид, неприятный запах изо рта, преждевременная потеря зубов. Кроме того, наличие очагов инфекции во рту — путь к инфицированию сосудов, сердца, почек, суставов. А это снижает качество жизни, ее продолжительность, сопротивляемость организма.

Вот почему одним из разделов стоматологии является анестезиология, которая призвана сделать лечение зубов безболезненным. Это достигается при помощи обезболивающих лекарственных препаратов. Но тут возникает другая проблема — страх перед уколом. У некоторых пациентов имеется непереносимость и анестетиков, и тех лекарственных препаратов, которые помогают снять чувство страха. Кроме того, традиционное обезболивание не всегда применимо для пациентов, перенесших инфаркт, имеющих сердечно-сосудистые патологии, беременных женщин.

Поэтому приходится искать другие, немедикаментозные способы успокоить пациента, избавить его от негативных ощущений. Например, давно применяется аудиоаналгезия — воздействие на центральную нервную систему посредством музыки.

И наконец, последнее достижение техники — вот такие видеоочки. Они позволяют подойти к каждому пациенту индивидуально. Одному поможет успокоиться и расслабиться специально подобранная музыка, другому нужно просто чем-то занять время, и он с удовольствием посмотрит боевик, третьему больше подойдет мелодрама.

Конечно, главные поклонники этого метода — дети, особенно подростки; они просто в восторге от видеоочков. Во-первых, им нравится сама необычность процедуры. Во-вторых, они не замечают, как проходит лечение. Бывает, врач уже закончил свои манипуляции, а ребенок не может оторваться от фильма. Один наш маленький пациент сказал: "Мама, давай придем завтра, я еще не досмотрел".

Современные технологии стоматологического лечения рушат все стереотипы. Не важно, ребенок это или взрослый, все мы боимся чего-то, и искусство врача заключается в том, чтобы, максимально используя свой профессионализм и умение контактировать с пациентом, уловить его тревогу и волнение, оказать ему врачебную помощь и не позволить страху победить желание быть здоровым и красивым.

Александра ЛОБЗОВА.

Мужчыны асуджаны на выміранне?

Новы тэзіс брытанскіх генетыкаў выклікаў сапраўдны землятрус сярод медыкаў.

Паводле меркавання Стыва Джонса, выкладчыка генетыкі ў лонданскім Універсітэцкім каледжы, хлопчыкі слабейшыя за дзяўчынак яшчэ перад нараджэннем. На саракавым тыдні цяжарнасці ненароджаны хлопчык запознены ў развіцці ў параўнанні з дзяўчынкай на 4—6 тыдняў.

Хлопцы значна горш за дзяўчынак вучацца. Яны горш спраўляюцца са стрэсам, часцей перажываюць дэпрэсію. Мужчыны складаюць 70% усіх самагубцаў. З прычыны горшага рэфлексу і рухавай каардынацыі яны часцей за жанчын гінуць у аўтакатастрофах. Мужчыны складаюць пераважную большасць злачынцаў, педафілаў, злодзеяў і хуліганаў.

Мужчыны па ўсім свеце жывуць карацей за жанчын. Яны ў тры разы часцей за жанчын хварэюць на сэрца і паміраюць ад інфаркту.

Справа ў тым, што ў мужчын няма абарончага шчыта ў выглядзе эстрагену. А "вінаватая" ў гэтым храмасома Y, дзякуючы якой дзіця атрымлівае мужчынскі пол. Жанчыны маюць у клетачным ядры дзве амаль ідэнтычныя храмасомы X, адна з іх з'яўляецца свайго кшталту рэзервовай копіяй на выпадак, калі адна з іх будзе пашкоджаная.

Мужчынская храмасома назапасіла ў сабе мноства шкодных мутацый, якіх не было ў нашых дзядоў і прадзедаў. А кожнае наступнае пакаленне будзе дабаўляць яшчэ больш генетычнага смецця да гэтай храмасомы. У выніку, на думку брытанскіх генетыкаў, канец мужчыны наступіць прыблізна праз 125 тысяч гадоў.

Што канкрэтна з'яўляецца прычынай слабасці мужчыны? Генетыкі кажуць, што гэта тэстастэрон. Гармон, якім носьбіты так ганарацца, насамрэч нясе ім гібель.

Даследаванні пацвердзілі, што кастрыраваныя мужчыны жывуць у сярэднім на 13 гадоў даўжэй за астатніх.

Алеся КОВАЧ.

Родинки по наследству

Что мы всегда слышали о родинках? "Не мешает? Живите спокойно, не трогайте вы свою родинку!" Этот весьма популярный в прошлом совет убеждал нас в том, что изначально данные природой или появляющиеся с годами родинки должны оставаться неприкосновенными. А тронешь — не избежать беды. Отчасти это правда. Действительно, самостоятельное удаление родинок может привести к самым печальным последствиям. И следует также отметить, что далеко не каждая родинка нуждается в удалении.

Надеемся, что в нашей публикации вы найдете ответы на интересующие вас вопросы.

— Какими бывают родинки?

— Самые безобидные — плоские родинки (от розового до темно-коричневого цвета). Обычно они ведут себя "смирно", не травмируются и не создают неудобств. Единственное, о чем нужно помнить, — о защите таких родинок на открытых участках тела от солнечных лучей.

К выпуклым родинкам, особенно, если они часто задеваются одеждой, нужно относиться более внимательно. Если они на спине и на других не доступных вашему взгляду местах, поручите наблюдение за ними кому-нибудь из близких. И разумеется, если произойдут какие-то изменения — родинка станет больше, из плоской превратиться в выпуклую или изменит свои очертания, надо сразу же обратиться к специалисту.

— В каком случае родинку нужно удалять?

— Если она расположена так, что постоянно травмируется. К примеру, родинка на волосистой части головы часто задевается расческой. А если вы регулярно окрашиваете волосы, то на нее негативно воздействуют еще и красители. Родинку лучше удалить, если она постоянно натирается, например, воротником, бюстгальтером, поясом. Повреждение родинки провоцирует ее перерождение. А если в родинке уже есть раковые клетки, то травма может привести к тому, что они с током крови разнесутся по всем органам. Любителям саун, бань нужно непременно проконсультироваться у онколога и удалить родинки, которые доктор найдет потенциально опасными. Горячий пар вызывает воспаление, раздражение родинок и тем самым провоцирует их перерождение.

Если на родинке вдруг вырастает еще одна маленькая, дочерняя родинка, это свидетельствует о том, что "мамаша" находится в возбужденном состоянии и лучше ее удалить вместе с "потомством".

— Можно ли удалить родинку в домашних условиях?

— Некоторые считают, что родинки можно удалять самому, перевязывая их, например, шелковой нитью. Это глубокое заблуждение. Попытки перевязывать бородавки, папилломы тонкой шелковой нитью зачастую только провоцируют рост этих образований. Сегодня в продаже есть препараты на основе чистотела, предназначенные для сведения бородавок. Но ни родинки, ни папилломы, ни бородавки лучше не удалять самостоятельно никакими средствами! Сок чистотела по своему составу схож с йодом, поэтому длительное воздействие препарата вызывает ожог кожи. Прижигание йодом еще более опасно — он агрессивнее чистотела. Усердно стараясь избавиться от папиллом при помощи йода, вы можете получить рубцы на коже. Грамотно удалит родинку только дерматолог или онколог.

— Что делать, если родинка стала изменяться?

— Если цвет родинки начинает меняться, она увеличивается, трескается, превращается в язвочку, необходимо, не впадая в панику, обратиться к дерматологу. Вышеуказанные симптомы иногда могут свидетельствовать об образовании опухоли, в частности, меланомы. Во избежание этого нужно регулярно наблюдаться у врача.

"Домашний доктор".

Мадыфікаваныя кампаненты выявяць у лабараторыі

На базе Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя будзе створана лабараторыя па выяўленні ў прадуктах генетычна мадыфікаваных кампанентаў. Яна пачне працу прыкладна ў жніўні гэтага года.

Закон, па якім усе прадукты з генетычна мадыфікаванымі інгрэдыентамі падлягаюць абавязковай рэгістрацыі, пачаў дзейнічаць у Беларусі з 1 студзеня 2004 года. Вытворца, які выкарыстоўвае генетычна мадыфікаваныя інгрэдыенты, абавязаны паведаміць аб гэтым санітарным службам. Калі ўтрыманне генетычных інгрэдыентаў у прадуктах харчавання перавышае 2 працэнты, вытворца абавязаны аб гэтым паведаміць пакупніку. Адпаведны надпіс павінен наносіцца на ўпакоўку побач са складам прадукту. Такія меры, на думку экспертаў цэнтра, "дазволяць палепшыць сітуацыю з паступленнем на спажывецкі рынак краіны прадукцыі, патэнцыяльна небяспечнай для здароўя", а таксама забяспечыць насельніцтва якаснымі, небяспечнымі і ў той жа час таннымі прадуктамі.

Да харчовай сыравіны, якая падлягае сертыфікацыі, адносіцца соя, кукуруза, бульба, таматы, кабачкі, дыня, папайя, цыкорый, харчовыя дабаўкі, біялагічна актыўныя дабаўкі да ежы, а таксама прадукты для дзіцячага, дыетычнага і лячэбна-прафілактычнага харчавання.

Вольга АСІПЕНКА.

КОМПЕТЕНТНОЕ МНЕНИЕ

Простатит приводит к импотенции

Одно из самых распространенных урологических заболеваний среди мужчин — простатит. Подсчитано, что у не менее 5% мужчин в тот или иной период жизни выявляются симптомы этого заболевания. "И если затянуть визит к врачу, осложнения могут быть самые неприятные, вплоть до импотенции и бесплодия", — говорит кандидат медицинских наук Владимир ОСТРОВСКИЙ.

— Владимир Иванович, что должен знать мужчина о таком заболевании, как простатит?

— Во-первых, что простатит — это воспаление предстательной железы, которое вызывается как рядом бактериальных возбудителей, так и другими причинами. Чаще всего им болеют мужчины в возрасте 20—45 лет, т.е. мужчины детородного возраста, живущие активной половой жизнью.

— На пустом месте болезнь, видимо, не возникает? Кто рискует заболеть простатитом?

— Само по себе попадание инфекции в предстательную железу не вызывает всех проявлений заболевания. Для развития простатита нужны и предрасполагающие факторы. Прежде всего рискуют заболеть мужчины, которые ведут беспорядочную половую жизнь. Часто простатит развивается как осложнение хронического инфекционного заболевания, передающегося половым путем, — хламидиоза, трихомониаза, уреаплазмоза или другого. Общее переохлаждение организма может также привести к простатиту.

К возникновению патологии приводит застой в предстательной железе, нарушение кровообращения, причинами которых могут быть сидячий образ жизни и нерегулярные занятия сексом. Считается нормой, что два-три раза в неделю мужчина должен иметь половой акт. Допускаются, конечно, отклонения в ту или другую сторону, ведь все люди разные.

"Благодатным" фактором для развития воспаления в предстательной железе служит длительное воздержание, прерванный половой акт, частые запоры, злоупотребление спиртными напитками.

— Каковы симптомы заболевания?

— По некоторым данным, симптомов простатита около сотни.

Чаще простатит развивается в хронической форме, не беспокоя мужчину слишком сильно. Для хронического простатита характерны ноющие боли в надлобковой области, яичках, промежности, паховых областях. Болевые ощущения наблюдаются и в пояснично-крестцовом отделе позвоночника, так как на воспалительные процессы в предстательной железе реагирует тазовое нервное сплетение. Возникают неприятные ощущения при мочеиспускании, могут отмечаться незначительные слизистые выделения из мочеиспускательного канала — это, к слову, один из наиболее характерных симптомов хронического простатита.

Простатит опасен тем, что, если его не лечить, у мужчины могут возникнуть проблемы с эрекцией. Это связано с вовлечением в воспалительный процесс нервов, ответственных за эректильную функцию, которые проходят через предстательную железу. Нетрудно представить, что испытывает мужчина, который не может удовлетворить свою партнершу. Порой у них нарушается психо-эмоциональная система вплоть до развития неврозов, психопатии. Лечить больных простатитом должны не только урологи, но и психотерапевты.

— Простатит излечим?

— Воспаление предстательной железы — это заболевание, избежать которого значительно проще, чем вылечить. Если у мужчины появились симптомы заболевания, надо **немедленно** идти к врачу. Диагностика как острого, так и хронического простатита не представляет для уролога сложности. Но хроническая форма требует длительного, порой до нескольких месяцев, лечения. А практика показывает, что достаточно двух месяцев, чтобы острая форма заболевания переросла в хроническую.



— А что предлагает современная медицина больным простатитом?

— Комплексную терапию. Врач должен выяснить причину заболевания, а потом назначать лечение. Как правило, это противовоспалительная терапия, физиотерапевтическое лечение, массаж предстательной железы.

Подбор антибактериального препарата, дозы и схемы применения для лечения простатита всегда должны производиться индивидуально и только после необходимых анализов урогенитальной микрофлоры.

Никогда нельзя прерывать или приостанавливать прием препарата без консультации с доктором.

Массаж предстательной железы является уникальным и незаменимым методом лечения простатита, так как необходим для рассасывания воспалительного инфильтрата в тканях простаты, улучшения кровообращения и лимфообращения, устранение венозного стаза. После массажа предстательной железы улучшается эрекция, увеличивается по времени половой акт, восстанавливается дренажная функция, возрастает подвижность сперматозоидов и исчезают болевые ощущения в результате уменьшения застоя.

Мужчина должен знать, что лечение воспаления предстательной железы — процесс длительный. Не всегда есть возможность полностью излечить больного от простатита, но устранить симптомы заболевания и вызвать стойкую продолжительную ремиссию современная медицина в силах. А там уже от самого больного будет зависеть продолжительность этого периода. Если он будет четко и тщательно соблюдать все рекомендации врача, то неприятные и надоевшие симптомы могут исчезнуть навсегда.

К слову, лечить простатит мужчина должен и из уважения к любимой женщине. Медицинская статистика свидетельствует, что у женщины, чьи мужья страдают хроническим простатитом, нередко бывают выкидыши, цистит, пиелонефрит.

Мария ЭЙСМОНТ.

P.S.Кандидат медицинских наук Владимир Островский ведет прием пациентов в медицинском центре "Асмедсервис".

Адрас рэдакцыі:

220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, правы ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 27 530 экз. Заказ № 676.